www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

1 верасня 2006 года, № 13 (1943)

# ВІВАТ, СТУДЭНТ!



**Дарагія першакурснікі!**

*Шчыра віншую вас! Вы прайшлі праз усе ўступныя выпрабаванні і сталі студэнтамі Беларускага дзяржаўнага універсітэта — флагмана вышэйшай школы краіны. Сёлета 30 кастрычніка БДУ адзначыць свой юбілей — 85 гадоў з дня заснавання. За гэты час наш універсітэт стаў найбуйнейшым адукацыйным, навукова-вытворчым і культурным цэнтрам Беларусі.*

*Ад усёй душы жадаю, каб БДУ стаў для вас родным, блізкім і любімым на ўсё жыццё. Ганарыцеся сваёй alma mater!*

*Радасці вам і поспехаў!*

***Рэктар БДУ, прафесар Васіль СТРАЖАЎ***

**СЁННЯ Ў НУМАРЫ:**

ВЫНІКІ ПРЫЁМНАЙ КАМПАНІІ Ў БДУ Стар. 2

ЗНАЙДЗІ СВАЮ ПАПАРАЦЬ-КВЕТКУ

Спецыяльна для першакурснікаў — БДУ ў лічбах і фактах Стар. 3

ШКОЛА ПЕРШАКУРСНІКА Стар. 4

## КЛЯТВА ПЕРШАКУРСНІКА

***Мы, першакурснікі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, уступаючы ў шэрагі студэнцкага брацтва вядучай ВНУ краіны, урачыста клянемся:***

***прыняць эстафету годнага служэння айчыннай навуцы і культуры на карысць нашай дзяржаве;***

***не шкадуючы сіл, спасцігаць назапашаныя чалавецтвам веды;***

***высока несці, захоўваць і множыць слаўныя традыцыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, ва ўсім быць узорам сумленнасці, высакароднасці, працаздольнасці і дысцыпліны, актыўна ўдзельнічаць у грамадскім, навуковым і культурным жыцці роднай alma mater;***

***усю сілу розуму, увесь пал свайго сэрца накіроўваць на павышэнне аўтарытэту айчыннай навукі і адукацыі;***

***з гонарам насіць гордае званне студэнта;***

***быць вартымі грамадзянамі Рэспублікі Беларусь —***

***Клянемся!***

***Клянемся!***

***Клянемся!***




*Сёння мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі адслужыць малебен у кафедральным Свята-Духавым саборы ў гонар новага навучальнага года ў Белдзяржуніверсітэце.*

*Святочная праграма "Віват, студэнт!" адбудзецца сёння ў Палацы спорту. Першакурснікаў будуць вітаць рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў і дэканы ўсіх факультэтаў. Пасля пройдуць канцэрт і дыскатэка.*

## ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

Сёння рэктар Белдзяржуніверсітэта прафесар Васіль Стражаў праводзіць адкрыты ўрок для навучэнцаў Ліцэя БДУ з нагоды Дня ведаў.

Падчас святкавання юбілею БДУ будзе падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве нашага універсітэта з Таўрычаскім універсітэтам імя Вярнадскага — найстарэйшай ВНУ Крыма. Дамоўленасць пра гэта дасягнута паміж кіраўнікамі абедзвюх ВНУ.

Прызначана новае кіраўніцтва двух прадпрыемстваў БДУ. Навукова-вытворчае рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Адамас БДУ» узначаліў Андрэй Карпіловіч, а вучэбна-навукова-вытворчае рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Унітэхпрам БДУ» — Павел Шульга.

Усе 10 інтэрнатаў Студгарадка БДУ атрымалі «Пашпарты гатоўнасці» аднымі з першых сярод сталічных ВНУ. На бягучы рамонт будынкаў патрачана каля 150 млн. рублёў. Інтэрнаты змогуць прыняць больш за 6000 студэнтаў, у тым ліку каля 2000 першакурснікаў.

Кіраўніцтва Будупраўлення № 66 ААТ «Будтрэст №7» даслала ў БДУ ліст-падзяку за працу будатрада нашага універсітэта на будоўлі гатэля «Еўропа». Матэрыял пра будатрады чытайце на 2-й стар.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

АКТУАЛЬНА

# ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ ПРЫЁМНАЙ КАМПАНІІ



Прыёмная кампанія ў нашым універсітэце закончылася 14 жніўня. На дзённую бюджэтную форму навучання паступілі 1902 чалавекі. Сярод сённяшніх першакурснікаў БДУ 16 "мэтавікоў", 305 медалістаў, а таксама 130 пераможцаў міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд, лаўрэатаў спецфонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў. Новымі студэнтамі БДУ сталі 19 замежнікаў — грамадзянаў Расіі, Казахстана, Кіргізіі, Таджыкістана. Вясковых жыхароў на першым курсе менш, чым гарадскіх (218 супраць 1684). Як заўжды, у ліку "навічкоў" шмат выхаванцаў сталічных школ: 36,7% ад агульнай колькасці першакурснікаў.

Як вядома, на некаторыя спецыяльнасці пры паступленні існаваў конкурс сертыфікатаў: іспытаў здаваць было не трэба, а кандыдаты ў БДУ выбіраліся па выніках цэнтралізаваных тэстаў. Сярод такіх спецыяльнасцяў самы высокі прахадны бал (357) быў на "Сусветную эканоміку". У тройку лідэраў паводле попыту ўваходзяць "Лінгвакраіназнаўства" (342 — для гарадскіх выпускнікоў і 329 — для вясковых) і "Мытная справа" (333 і 268 адпаведна). За імі ідуць "Міжнароднае права" (331 і 294), "Сучасныя замежныя мовы (спецыялізацыя — пераклад)" (331 і 289), "Міжнародныя адносіны" (330 і 323), "Менеджмент (спецыялізацыя — менеджмент у сферы міжнароднага турызму)" (327), "Інфармацыя і камунікацыя (напрамак — сацыяльныя тэхналогіі, навукова-педагагічная дзейнасць)" (321 і 295), "Менеджмент (спецыялізацыя — сацыяльны менеджмент)" (316), "Паліталогія" і "Культуралогія (спецыялізацыя — амерыканістыка і англійская мова)" (па 315), "Эканамічная тэорыя", "Эканоміка", "Фінансы і крэдыт", "Менеджмент (спецыялізацыя — міжнародны менеджмент)" (па 313).

Сярод тых спецыяльнасцяў, дзе трэба было здаваць два творчыя іспыты, самы вялікі попыт быў на "Дызайн (напрамак — камунікатыўны дызайн)": для выпускнікоў гарадскіх школ прахадны бал быў 41,7, для вясковых — 36,8. У першую пяцёрку ўвайшлі таксама "Дызайн (напрамак — дызайн прадметна-прасторавых комплексаў)" (39,4 і 35,7 бала адпаведна), "Журналістыка" (36,5), "Інфармацыя і камунікацыя (напрамак — тэхналогіі камунікацыі)" (36,1) і "Міжнародная журналістыка" (35,9).

Варта адзначыць, што самы вялікі конкурс (19,6 прэтэндэнта на 1 месца) зафіксаваны на спецыяльнасць "Дызайн (напрамак — камунікатыўны дызайн)". Следам за ёй па папулярнасці ідзе "Дызайн (напрамак — дызайн прадметна-прасторавых комплексаў)" (12,6), "Паліталогія" (9,3), "Міжнароднае права" (7,2), "Міжнародныя адносіны" (6,8).

Былі і спецыяльнасці, якія не карысталіся папулярнасцю ў абітурыентаў. Заяваў на іх было пададзена менш, чым нават абвяшчаўся набор. Самы нізкі конкурс назіраўся на такія спецыяльнасці, як "Фізічная электроніка" (0,48 чалавека на 1 месца), "Радыёфізіка" (0,75), "Механіка" (0,76), "Прыкладная матэматыка" (0,8), "Эканамічная кібернетыка" (0,9), "Фізіка" (0,91).

На завочную бюджэтную форму паступілі 337 чалавек.

На платную форму навучання залічана навучэнцаў нават больш, чым на бюджэтную: на дзённую — 2058 чалавек, на завочную — 1134.

Сярэдні конкурс па БДУ склаў 2,5 чалавека на месца.

Асобна варта сказаць пра юрыдычны каледж БДУ. Згодна з планам сюды прынялі 100 навучэнцаў: 50 абітурыентаў-дзевяцікласнікаў і столькі ж выпускнікоў 11-х класаў. Выбіраць было з каго: у першай катэгорыі было пададзена 860 заяваў, у другой — 140. Прахадны бал для дзевяцікласнікаў склаў 22 для гарадскіх выпускнікоў і 19,7 — для вясковых (трэба было здаць дыктоўку па беларускай або рускай мове і кантрольную работу па матэматыцы). Для выпускнікоў 11-х класаў прахадны бал склаў, адпаведна, 181 у гарадскіх і 164 у вясковых (у гэтым выпадку ўлічваліся 2 сертыфікаты).

Вынікі ўступнай кампаніі яшчэ будуць усебакова прааналізаваныя. Разам з тым, ужо цяпер стаў відавочны шэраг праблем, якія неабходна абмеркаваць. Найперш гэта тычыцца арганізацыі прыёму на прыродазнаўчыя спецыяльнасці і правядзення профільных экзаменаў; пытанняў, звязаных з прыёмам інвалідаў і дзяцей-сірот ды на завочную бюджэтную форму навучання; тэрмінаў прыёму дакументаў.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**
**Фота Юліі ПАПОВАЙ**

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

# САМЫЯ ПРАЦАВІТЫЯ

***Улетку студэнцкія атрады Белдзяржуніверсітэта працавалі ў некалькіх напрамках: будаўнічыя, валанцёрскія, педагагічныя і сельскагаспадарчыя. Іх дзейнасць арганізавалі і каардынавалі Штаб працоўных справаў БРСМ БДУ, а таксама Студгарадок БДУ.***

Найбольшымі па колькасці былі будаўнічыя і валанцёрскія атрады. Будаўнічыя атрады са студэнтаў нашага ўніверсітэта працавалі на гатэлі "Еўропа", на цяплічным комплексе ў вёсцы Багатырова Мінскага раёна, а таксама на корпусе для гуманітарных факультэтаў і ў інтэрнатах. Валанцёрскія атрады дапамагалі ветэранам, упарадкоўвалі тэрыторыю спарткомплексу БДУ, працавалі ў грамадскай прыёмнай камісіі ды інш. Сельскагаспадарчы атрад дзейнічаў у РУП "Шчамысліца", а педагагічны — у САК "Брыганціна".

Калі казаць пра атрады, арганізаваныя Штабам працоўных справаў, то найлепшымі, на маю думку, паказалі сябе тыя, што працавалі на будаўніцтве гатэля "Еўропа", цяплічнага комплексу ў вёсцы Багатырова і на ўпарадкаванні тэрыторыі спарткомплексу БДУ. Гэтыя атрады вылучаліся асаблівай дысцыплінай і якасцю выкананых работ.



Дарэчы, Штаб працоўных справаў дзейнічае на працягу года. І запісвацца на працаўладкаванне можна ўжо цяпер — нават, калі гаворка ідзе пра лета: пачынаючы з лютага мы праводзім папярэдні запіс жадаючых у будаўнічыя атрады.

**(Галоўны корпус БДУ, каб. 205, тэл. 209-52-61)**

**Дзмітрый ЛЕБЕДЗЬ, начальнік Штаба працоўных справаў**
**Фота Тамары СУВОРАВАЙ**

ВЕДАЙ НАШЫХ!

# З АДЭСЫ З МЕДАЛЯМІ

Усе 7 удзельнікаў каманды нашага ўніверсітэта атрымалі высокія ўзнагароды на XIII Міжнароднай студэнцкай матэматычнай алімпіядзе, якая праходзіла ў Адэсе ў канцы ліпеня. "Залата" прывезлі студэнты факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Дзмітрый Дудко (IV курс) і Вікторыя Лебедзь (III курс). Срэбраныя ўзнагароды атрымалі студэнты гэтага ж факультэта Алена Пірутка (IV курс), Аляксандр Мядзведзеў (III курс), Міхаіл Блоцкі (I курс), а таксама першакурснікі механіка-матэматычнага факультэта Іван Блізнец і Уладзімір Ягораў. У алімпіядзе ўдзельнічалі каманды з 30 краінаў свету.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

# БДУ — КІТАЙ: ПАДЗЕІ ЛЕТА

У БДУ падпісаны пратакол аб намерах па супрацоўніцтве з Канцылярыяй Кітайскай Народнай Рэспублікі па распаўсюджванні кітайскай мовы за мяжой. Гэты дакумент прадугледжвае супрацоўніцтва ў справе стварэння Рэспубліканскага інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя пры Белдзяржуніверсітэце. Навучальная ўстанова будзе створаная на базе Рэспубліканскага цэнтра кітаязнаўства "Іерогліф" БДУ.

***

Прадстаўнікі Белдзяржуніверсітэта прынялі ўдзел у рабоце першай міжнароднай канферэнцыі інстытутаў імя Канфуцыя, якая адбылася ўлетку ў Пекіне. У яе працы ўзялі ўдзел каля 200 чалавек з 38 краін і рэгіёнаў свету. На працягу двух дзён удзельнікі абмяркоўвалі шляхі і метады распаўсюджвання кітайскай мовы і культуры ў свеце.




*Падчас прэс-канферэнцыі ў БДУ, прысвечанай супрацоўніцтву універсітэта з арганізацыямі КНР*

**Фота Юліі ПАПОВАЙ**

***

Дагавор пра супрацоўніцтва падпісаны паміж нашым універсітэтам і Хенанскім дзяржаўным фінансава-эканамічным інстытутам. Бакі дамовіліся развіваць двухбаковыя кантакты ў розных сферах універсітэцкага жыцця: абменьвацца выкладчыкамі для чытання лекцый, праводзіць семінары і канферэнцыі, абменьвацца навучальна-метадычнай літаратурай па адукацыйна-прафесійных праграмах і навучальных планах, супрацоўнічаць у сферы навуковай дзейнасці.

***

Дэлегацыя Харбінскага політэхнічнага ўніверсітэта наведала Белдзяржуніверсітэт для ўзгаднення рэалізацыі дагавора, падпісанага ў лістападзе 2005 года. Падчас перамоваў з кіраўніцтвам нашага ўніверсітэта госці асабліва цікавіліся навукова-тэхнічнымі распрацоўкамі і магчымасцямі рэалізацыі прадукцыі БДУ на кітайскім рынку.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

# НА ЧЫТАННІ ДА ЮБІЛЯРА

9 верасня 2006 г. на філалагічным факультэце ў аўдыторыі 304 адбудуцца навуковыя чытанні, прысвечаныя 70-годдзю Арнольда Яфімавіча Міхневіча, доктара філалагічных навук, прафесара, акадэміка Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі, выдатніка народнай асветы, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі. У чытаннях прымуць удзел прадстаўнікі розных навуковых установаў Беларусі, калегі і вучні.

**Паводле інфармацыі кафедры сучаснай беларускай мовы**

**Ад рэдакцыі:** гутарку з юбілярам Арнольдам Міхневічам чытайце ў наступным нумары газеты.

## З ГІСТОРЫІ БДУ

# ЗНАЙДЗІ СВАЮ ПАПАРАЦЬ-КВЕТКУ






Гонар нашага універсітэта ў тым, што ён быў **першым** (не лічачы Горы-Горацкага інстытута пазамінулага стагоддзя і Віленскага універсітэта, створанага яшчэ ў Рэчы Паспалітай).

**Першы рэктар** БДУ — Уладзімір Пічэта, які быў заслужаным прафесарам рэспублікі, правадзейным членам Акадэміі навук. Усяго за гады існавання універсітэта было **17** рэктараў (разам з сённяшнім — Васілём Стражавым).

11 ліпеня **1921 года** адбылося адкрыццё універсітэта "на паперы", а **30 кастрычніка** — фактычнае (святкаваць прынята менавіта гэтую дату, таму рыхтуйцеся: наступнае вялікае свята пасля сённяшняга "Віската" — дзень нараджэння alma mater). Ужо на наступны дзень для **1039** студэнтаў пачаліся заняткі. **Першая лекцыя** прагучала для тых, хто вучыўся на факультэце грамадскіх навук, прачытаў яе прафесар Канчалоўскі.

**Першы будынак** БДУ размяшчаўся ў цяперашнім корпусе гістарычнага факультэта. Там адбылася і першая лекцыя ў аўдыторыі № 1.

**49** — столькі выкладчыкаў налічвалася ў БДУ на момант яго стварэння, сярод іх было 14 прафесараў і 25 дацэнтаў.

**3** — менавіта столькі факультэтаў першапачаткова было ва універсітэце: рабочы, медыцынскі і грамадскіх навук.

**1000** — столькі дрэваў было пасаджана ва ўнутраным дворыку універсітэта.

**Медуніверсітэт, Педуніверсітэт, БДЭУ** і інш. — усе гэтыя ВНУ створаны на базе нашага універсітэта.



З першымі 20 гадамі існавання БДУ звязана дзейнасць маршала Жукава, Якуба Коласа (у якасці выкладчыкаў), студэнтамі універсітэта былі Пятро Глебка, Кандрат Крапіва, Пятрусь Броўка.

**Вучыцца, вучыцца і яшчэ раз вучыцца:** заняткі для студэнтаў БДУ вяліся нават у час вайны — з кастрычніка 43-га на станцыі Сходня (у Падмаскоўі), а менш чым праз год — у родных пенатах.


For the Byelorussian Soviet Socialist Republic:
Pour la République Soviétique Socialiste de Biélorussie:
白俄羅斯蘇維埃社會主義共和國:
За Белорусскую Советскую Социалистическую Республику:
Por la República Socialista Soviética Bielorrusa:

Супрацоўнікі нашага універсітэта ўдзельнічалі і ў падпісанні **Статута ААН**: пад ім ёсць аўтографы прафесара Перцава і дацэнта Шмыгава — выкладчыкаў БДУ.

**Герб універсітэта** быў зацверджаны **25 мая 2000 года.** У аснове яго — стылізаваная выява ліста папараці, які свеціцца. Блакітны фон сімвалізуе навуку, вучонасць, срэбранае кола (святло) — імкненне да ведаў, ісціны. Здабыць папараць-кветку можна толькі пераадолеўшы ўсе перашкоды цёмных сіл, няведання, няўмення, а той, хто здолее зрабіць гэта, стане мудрым і шчаслівым. Няхай родны універсітэт дапаможа вам знайсці сваю папараць-кветку! Поспехаў!

**Па матэрыялах Музея гісторыі БДУ падрыхтавала Ала МАЧАЛАВА**

*На фота:*
*Дэлегацыя Беларускай ССР на канферэнцыі ў Сан-Францыска. Май-чэрвень 1945 г. Сярод дэлегатаў — прафесар БДУ У.М.Перцаў і дацэнт Ф.П. Шмыгаў.*

*Подпісы пад Статутам ААН дэлегатаў ад Беларусі.*

# БДУ ў СМІ Беларусі




У чэрвені, ліпені і жніўні ў СМІ нашай краіны шмат было адведзена месца падзеям, якія адбываліся ў БДУ ў гэты перыяд. Асабліва падрабязна асвятляўся ход прыёмнай кампаніі (пачынаючы з **10.07 і да сярэдзіны жніўня**, больш за 60 паведамленняў з'явілася на лентах інфармагенцтваў **БЕЛТА, БелаПАН, ІНТЭРФАКС, на Інтэрнэтсайтах, а таксама на старонках "Настаўніцкай газеты", "Рэспублікі", "Звязды", "Народнай газеты", "Знамя юности", "Вечернего Минска", "Комсомольской правды"** і г.д., у тым ліку ў праграмах навін і іншых перадачах **БТ, АНТ, ЛАД, СТВ.**

Акрамя таго былі надрукаваны наступныя матэрыялы:

**"Настаўніцкая газета" (08.08)** — "Неверагодная матэматыка" і звычайны футбол": пра XI рэспубліканскую навукова-даследчую летнюю школу, арганізаваную БДУ ў "Брыганціне".

Пра ўзнагароды, якія атрымалі студэнты БДУ на ХШ Міжнароднай студэнцкай матэматычнай алімпіядзе ў Адэсе: **"Голас Радзімы" (02.08)** — "Студенты БГУ выиграли международную математическую олимпиаду"; **"Рэспубліка" (04.08)** — "Математики БГУ снова первые"; **"Народная газета" (04.08)** — "Двадцать пять золотых"; **"Вечерний Минск" (04.08)** — "Знай наших!"; **"Настаўніцкая газета" (05.08)** — "Шосты раз не з пустымі рукамі"; **"Минский курьер" (09.08)** — "Вернулись золотыми и серебряными".

**"Настаўніцкая газета" (01.08)** — "У Беларусі ствараецца свая рускамоўная літаратура": гутарка з доктарам філалагічных навук, прафесарам, загадчыцай кафедры рускай літаратуры філфака БДУ Святланай Ганчаровай-Грабоўскай.

**"Полымя" (№ 7)** — "Арыенціры Сяргея Дубовіка, альбо Журналістам стаць — не поле перайсці".

**"Настаўніцкая газета" (25.07)** — "Серабро, бронза і нюансы вышэйшай матэматыкі": пра ўдзел у 47-й міжнароднай алімпіядзе школьнікаў беларускай каманды пад кіраўніцтвам дацэнта механіка-матэматычнага факультэта БДУ Ігара Варановіча, у складзе якой вызначыліся і навучэнцы ліцэя БДУ.

Пра работу археалагічнай экспедыцыі гістарычнага факультэта БДУ каля вёскі Кавальцы на Гродзеншчыне: **"Гродненская правда" (19.07)** — "Возле деревни Ковальцы жили охотники на северных оленей"; **"Минский курьер" (21.07)** — "Здесь жили древние охотники"; **"Знамя юности" (28.07)** — "Охота на древних оленей".

**"Настаўніцкая газета" (11.07)** — "Web-праграмістаў пачнуць рыхтаваць у БДУ".

**"Вечерний Минск" (11.07)** — "Видеопоэма об иноке": пра перамогу на міжнародным конкурсе відэафільмаў у Маскве дакументальнай стужкі "Паэма веры" студэнтаў журфака БДУ Андрэя Куцілы і Аляксандра Налівайкі.

**"Знамя юности" (07.07)** — "Мера зла на чаше справедливости": па выніках круглага стала на тэму "Царква і сацыяльныя праблемы сучаснага грамадства", які адбыўся ў Інстытуце тэалогіі БДУ.

**"Рэспубліка" (30.06)** — аб працоўным семестры ў БДУ: "Если есть желание работать"; "Если время не терять..." **(11.07).**

**"Рэспубліка" (27.06)** змясціла артыкул пра звышцвёрдыя матэрыялы "Алмазот" вытворчасці прадпрыемства "Адамас БГУ".

**"Белгазета" (26.06)** — рэцэнзія Андрэя Курэйчыка на спектакль "Хор" тэатра-студыі БДУ "На філфаку".

**"Народная газета"(24.06)** — "Мир не без добрых людей": пра гурткі па вывучэнні замежных моваў у дзіцячых дамах, ініцыятарам якіх стаў студэнт юрфака БДУ Ігар Вайсман.

**"Советская Белоруссия" (24.06)** — гутарка з выкладчыкам Інстытута тэалогіі імя св. Мефодзія і Кірылы БДУ айцом Аляксандрам Шымбалёвым ("Небесная механика").

**"Вечерний Минск" (23.06)** — "Кулибин из БГУ": пра лепшага вынаходніка Беларусі 2006 года дацэнта механіка-матэматычнага факультэта БДУ Валерыя Супруна. Інтэрв'ю з ім друкуе і **"Настаўніцкая газета" (22.06).**

**"Народная газета" (22.06)** — гутарка з загадчыкам кафедры менеджменту эканамічнага факультэта БДУ прафесарам Барысам Паньшыным, прысвечаная пытанням інтэграцыі Беларусі і Расіі ("Любой союз закономерен, если он созрел в умах людей").

Тэме супрацоўніцтва БДУ і КНР прысвечаны шэраг матэрыялаў у газетах **"Рэспубліка" (22.06)** — "В БГУ экзамены будут сдавать...на китайском"; "В БГУ — гости из бывшего китайско-русского техникума" **(08.07)**, "Язык до Пекина доведет" **(18.07)**; **"Настаўніцкая газета" (11.07)** — "Супрацоўніцтва з кітайскімі універсітэтамі працягваецца"; **"Минский курьер"** — "Китайская грамота станет доступнее" **(22.07)**, "Будем учить китайскую грамоту" **(25.07)**; **"Вечерний Минск" (24.07)** — "В Минске откроют институт имени Конфуция"; **"Настаўніцкая газета" (25.07)** —"Беларуска-кітайскі тэхнапарк будзе створаны на базе БДУ"; **"Народная газета" (25.07)** — "Китайская грамота".

Пра гэтыя і іншыя падзеі ў БДУ шырока паведамлялі ў сваіх матэрыялах інфармацыйныя агенцтвы БЕЛТА, БелаПАН, ІНТЭРФАКС, АТН, тэлеканалы ЛАД, БТ, СТВ, АНТ, Беларускае радыё і FM-станцыі.

**Агляд падрыхтаваны прэс-службай БДУ**

## АБ'ЯВЫ

### "ІНСТЫТУТ ЯДЗЕРНЫХ ПРАБЛЕМ" БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

Лабараторыя тэарэтычнай фізікі: вядучы навуковы супрацоўнік — 1 чалавек.

**Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 11, аддзел кадраў, пакой 315, тэл. 226-42-31.**

**Увазе абітурыентаў!**

### ЦЭНТР ФІЛАЛАГІЧНЫХ ПАСЛУГ БДУ

**абвяшчае набор слухачоў па падрыхтоўцы:**

— да цэнтралізаванага тэсціравання па мовах (беларуская, руская, замежная);

— да ўступных экзаменаў у навучальныя ўстановы па беларускай і рускай літаратурах, замежных мовах.

Фарміруюцца групы слухачоў у колькасці 3, 6 чалавек.

Выкладчыкі Цэнтра — высокакваліфікаваныя спецыялісты, дацэнты, кандыдаты навук.

**Заняткі — з кастрычніка 2006 г. па май 2007 г.**

**Наш адрас: вул. К. Маркса, д. 31, аўд. 59.**

**Тэл. для даведак 222-33-65.**

### ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ"

**запрашае на павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку выкладчыкаў і спецыялістаў установ адукацыі па наступных напрамках:**

1. Мова як сродак міжкультурнай камунікацыі і полікультурнай адукацыі сучаснага спецыяліста (для выкладчыкаў рускай мовы як замежнай і спецыялістаў па рабоце з замежнымі студэнтамі) — **04.09—15.09;**

2. Замежная мова (англійская) як аснова сацыяльнай дзелавой камунікацыі сучаснага спецыяліста (для выкладчыкаў, асістэнтаў, навуковых супрацоўнікаў ВНУ) — **11.09—18.11,** заняткі 2 разы ў тыдзень;

3. Выкарыстанне пакета "Microsoft Office 2000" у навучальным працэсе і навуковых даследаваннях (для выкладчыкаў, асістэнтаў, навуковых супрацоўнікаў, вучэбна-дапаможнага персаналу ВНУ) — **11.09—17.11,** заняткі 2 разы ў тыдзень;

4. Тэорыя і методыка навучання гісторыі (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ, ПТВ, СШ) — **18.09—30.09;**

5. Прафілактыка залежных паводзін ва ўстановах адукацыі (для выкладчыкаў) — **18.09—30.09;**

6. Навука і пазанавуковыя веды (для выкладчыкаў ВНУ) — **18.09—28.10;**

7. Асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы: метадалогія і методыка выкладання (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ, ПТВ, СШ ) — **18.09—30.09;**

**Калі Вас зацікавіла наша інфармацыя і Вы гатовы прыняць удзел у курсах, тэлефануйце па №№ 222-83-03, 200-20-47** ***для папярэдняга запісу ў групы.***

**Наш адрас: 220007, г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, каб. 319, тэл./факс 200-25-51.**

### ГАЗЕТА "УНІВЕРСІТЭТ"

**запрашае да супрацоўніцтва пазаштатных аўтараў**

**Калі Вы адчуваеце ў сабе творчыя памкненні, калі хочаце, каб пра падзеі на вашым факультэце даведаўся ўвесь універсітэт, — ПІШЫЦЕ НАМ!**

**Наш адрас: вул. Бабруйская, 7, пакой 411, тэл. 209-53-45, e-mail: gazeta@bsu.by, сайт: www.gazeta.bsu.by**

# ШКОЛА ПЕРШАКУРСНІКА

***Учарашнія школьнікі сталі студэнтамі. Іншае жыццё, іншыя правілы. Каб вы не згубіліся ў плыні новай інфармацыі, прапануем вам у дапамогу своеасаблівы компас па універсітэце і яго структурах — «Школу першакурсніка». З пытаннямі, якія вас цікавяць, звяртайцеся ў рэдакцыю газеты, і мы будзем рады вам дапамагчы.***

## СТАНЬ ЛІДЭРАМ

***Падчас навучання ў БДУ маладыя людзі становяцца не толькі спецыялістамі ў абранай сферы: яны вучацца быць актыўнымі грамадзянамі сваёй краіны.***

**Студэнцкі саюз БДУ** падтрымлівае ініцыятывы, накіраваныя на развіццё студэнцкага самакіравання, міжнароднага маладзёжнага супрацоўніцтва, валанцёрскай дзейнасці.

**Пярвічная арганізацыя грамадскага аб'яднання "Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі"** (з правамі раённага камітэта) падтрымлівае ініцыятывы, скіраваныя на выхаванне патрыятызму, пераемнасці пакаленняў, узаемадзейнічае з Саветам ветэранаў БДУ, спрыяе другаснай занятасці студэнтаў.

**Савет старастаў БДУ** інфармуе студэнтаў пра падзеі ў навуковым, грамадскім, спартыўным і культурным жыцці універсітэта, абмяркоўвае з кіраўніцтвам БДУ праблемы, якія ўзнікаюць у студэнтаў падчас навучання.

**Савет па матэрыяльным стымуляванні і аказанні матэрыяльнай дапамогі студэнтам і аспірантам БДУ** прымае рашэнні пра ўстанаўленне надбавак і размеркаванні матэрыяльнай дапамогі студэнтам і аспірантам універсітэта.

**Студэнцкі савет па якасці адукацыі** БДУ спрыяе павышэнню якасці адукацыі ў БДУ, адлюстроўвае пазіцыю студэнтаў да дзейнасці універсітэта ў гэтай сферы, робіць прапановы па арганізацыі навучальнага працэсу.

**Пярвічная прафсаюзная арганізацыя студэнтаў** абараняе прафесійныя, працоўныя, сацыяльна-эканамічныя правы і законныя інтарэсы сваіх членаў **(прасп. Незалежнасці,4, галоўны корпус, каб. 203, тэл. 206-62-33).**

**Па больш падрабязную інфармацыю звяртайцеся ва ўпраўленне выхаваўчай работы з моладдзю: прасп. Незалежнасці, 4, галоўны корпус, каб. 205, 207, тэл. 209-50-59, 209-52-61**

## ШУКАЕМ ТАЛЕНТЫ

**Народная харавая капэла.** Заняткі адбываюцца па панядзелках, сярэдах, пятніцах у 19.30 у аўдыторыі 433 галоўнага корпуса.

**Народны фальклорны ансамбль «Тутэйшая шляхта»**. Заняткі адбываюцца па аўторках і чацвяргах з 17.00 да 19.00 у актавай зале філалагічнага факультэта (вул. К. Маркса, 31).

**Народны аркестр народных інструментаў.** Заняткі ладзяцца па панядзелках і сярэдах у 19.30 у аўдыторыі 607 галоўнага корпуса БДУ.

**Клуб аўтарскай песні.** Заняткі праводзяцца па аўторках у 18.00 у аўдыторыі 605 хімічнага факультэта.

**Народны фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Неруш».** Заняткі ладзяцца па аўторках і чацвяргах у 19.00 у галоўным корпусе.

**Народны ансамбль танца «Крыжачок».** Заняткі адбываюцца па панядзелках, сярэдах і чацвяргах у 19.30 у спартыўнай зале галоўнага корпуса.

**Народны музычны тэатр-студыя БДУ «На філфаку».** Заняткі ладзяцца па панядзелках, сярэдах, чацвяргах у 19.00 у актавай зале філалагічнага факультэта (вул. К. Маркса, 31).

**Народны тэатр-студыя «На балконе».** Заняткі адбываюцца з аўторка па пятніцу ў 18.00 на 5-м паверсе галоўнага корпуса БДУ.

Акрамя таго, у БДУ дзейнічаюць студыя эстраднай песні, вакальны ансамбль «Галант», хор народнай песні выкладчыкаў і супрацоўнікаў «Родніца», узорны дзіцячы ансамбль танца «Літарынка», каманда КВЗ БДУ.

**Вас чакаюць ва ўпраўленні па справах культуры БДУ: прасп. Незалежнасці, 4, пакой 211, тэл. 209-54-69**

## ДАПАМОЖА ПСІХАЛАГІЧНАЯ СЛУЖБА

У кожнага з нас бываюць перыяды, калі мы губляем упэўненасць, адчуваем непрыемныя перажыванні, стрэс. Не ладзяцца адносіны з сваякамі і блізкімі, узнікаюць праблемы ў кантактах з іншымі людзьмі. І не хапае ўласных сілаў, псуецца настрой, з'яўляецца адчуванне, што "разладзіўся механізм" і страчана жыццёвая раўнавага. Многія праходзяць праз гэта і працягваюць паўнацэнна жыць і працаваць. Пытанне толькі ў тым, колькі часу мы страцілі, колькі згубілі магчымасцяў, якія варыянты так і не змаглі рэалізаваць.

Нам неабходная дапамога іншых — тых, хто можа даць вартую параду. Такую дапамогу мы можам атрымаць, напрыклад, ад бацькоў, сяброў, старэйшых таварышаў. І вельмі часта гэтага дастаткова.

А калі няма магчымасці падзяліцца праблемай са знаёмымі людзьмі? Калі яны недаступныя ў патрэбны момант? Для гэтага існуюць спецыялісты-псіхолагі. Іх прафесійная дзейнасць грунтуецца на прынцыпах даверу, канфідэнцыйнасці, ананімнасці. Галоўная задача псіхолага — дапамагчы чалавеку самому справіцца з праблемай, выявіць і задзейнічаць уласны патэнцыял.

У Белдзяржуніверсітэце ўжо доўгі час працуе псіхалагічная служба. Яе спецыялісты (а гэта дыпламаваныя педагогі-псіхолагі) ладзяць псіхалагічныя кансультацыі. Кожны з іх курыруе пэўны факультэт. І ў вас ёсць магчымасць звярнуцца да спецыяліста, які лепей ведае спецыфіку вашага факультэта, але вы таксама можаце звярнуцца і да любога іншага псіхолага — паверце, вам не адмовяць, а добразычліва і з разуменнем выслухаюць і дапамогуць.

Акрамя аказання псіхалагічнай дапамогі, спецыялісты ладзяць шмат іншых мерапрыемстваў, накіраваных на прадастаўленне папулярнай псіхалагічнай інфармацыі, развіццё тых ці іншых навыкаў. Вы можаце наведаць:

— сацыяльна-псіхалагічныя трэнінгі па кантактах, развіцці дзелавых якасцяў, папырэнні творчага патэнцыялу, мастацтве кіраваць часам, эфектыўным планаванні ды інш.;

— студэнцкі псіхалагічны клуб, дзе можна даведацца інфармацыю па псіхалогіі, пагаварыць з аднадумцамі і цікавымі людзьмі і нават крыху адчуць сябе псіхолагам;

— клуб ралявых гульняў "Брама вымярэнняў", дзе вы можаце кантактаваць у рэжыме ралявой гульні, з карысцю бавіць час, пазнаёміцца з новымі людзьмі;

— студэнцкую псіхалагічную бібліятэку, дзе спецыяылісты падбяруць вам псіхалагічную і іншую літаратуру.

**Прыходзьце, мы чакаем вас: вул. Кастрычніцкая, 4, пакой 105, тэл. 206-60-37.**

**Руслан ПАПОК,
кіраўнік Псіхалагічнай службы БДУ**

## ПАХОД У БІБЛІЯТЭКУ

***Бібліятэка падчас навучання становіцца неад'емным памочнікам студэнтаў. Тут можна знайсці адказы амаль на ўсе пытанні. Каб праца ў бібліятэцы была эфектыўнай, варта ведаць, як храм ведаў функцыянуе, якія паслугі прапануе.***

Студэнты кожнага факультэта БДУ адносяцца да аднаго з 9 абанементаў і маюць права карыстацца толькі яго паслугамі. Затое яны могуць наведваць любую з 17 чытальных залаў, размешчаных амаль на кожным факультэце. У гэтым годзе адкрылася зала электронных інфармацыйных рэсурсаў: там ёсць доступ да паўнатэкставых, бібліяграфічных баз даных з навуковай і адукацыйнай інфармацыяй.

Фундаментальная бібліятэка БДУ аказвае як традыцыйныя, так і наватарскія паслугі. Сярод бясплатных — карыстанне карткавымі і электроннымі каталогамі, картатэкамі, базамі даных, выдача ў часовае карыстанне ў чытальных залах і на абанементах друкаваных выданняў, навучанне студэнтаў пошуку інфармацыі ў базах даных, арганізацыя разнастайных выставаў і прэзентацый.

У 2004 г. у бібліятэцы ўведзены платныя паслугі. Яны накіраваны, з аднаго боку, на спрашчэнне працы студэнта ў бібліятэцы, з другога — на збор сродкаў для далейшага папаўнення фондаў.

Гэта выдача кніг з чытальных залаў на ноч або на 1 гадзіну (напрыклад, для ксераксу), тэматычныя падборкі бібліятэкарам па запыце студэнта, афармленне і рэдагаванне бібліяграфічных спісаў да навуковых, дыпломных, курсавых і іншых прац, сканіраванне дакументаў і іншае. Развіваецца служба электроннай дастаўкі дакументаў: праз яе можна замовіць электронныя копіі артыкулаў.

Бібліятэка БДУ таксама займаецца платнай перадачай спісаных з яе фондаў выданняў. У будынку філалагічнага факультэта (вул. К.Маркса, 31) у кабінеце 124 у будныя дні з 11 да 16 гадзін дзейнічае выстава-продаж мастацкай, філасофскай, філалагічнай літаратуры і кніг па замежных мовах.

**Па дадатковую інфармацыю можна звяртацца на сайт ФБ БДУ www.library.bsu.by ці па тэлефонах 209-50-82 і 209-50-33**

**Фота Юліі ПАПОВАЙ**



## ВІРТУАЛЬНЫ ВЫХАД У СВЕТ

Афіцыйны сайт БДУ — **www.bsu.by,** у сетцы БДУ існуе і ўнутраны агульнауніверсітэцкі сайт (**http://intranet.bsu**), на якім службы універсітэта публікуюць аператыўную інфармацыю і дакументы, неабходныя ў тым ліку і студэнтам. У прыватнасці, на сайце ёсць інфармацыя пра медыятэкі. Медыятэкі — агульнауніверсітэцкія камп'ютарныя класы, прызначаныя для самастойнай работы студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў і супрацоўнікаў універсітэта. У структуры Цэнтра інфармацыйных тэхналогій створаныя тры агульнауніверсітэцкія медыятэкі:

**№ 1 — у корпусе геаграфічнага факультэта (вул. Ленінградская, 16, пакой 114);**

**№ 2 — у корпусе факультэта радыёфізікі і электронікі (вул. Курчатава, 5, пакой 211);**

**№ 3 — у корпусе БДУ па вул. Рэвалюцыйнай, 11 (пакой 203). Яе адкрыццё плануецца ў бліжэйшы час.**

Медыятэкі інтэграваныя ў карпаратыўную сетку БДУ, г.зн. у іх даступныя ўсе рэсурсы сеткі БДУ: навучальныя матэрыялы факультэтаў, сістэма e-University, бібліятэчныя рэсурсы і Інтэрнэт. Кожны камп'ютар аснашчаны навушнікамі, мікрафонам, прыладай чытання DVD-дыскаў і USB-портамі. Палова камп'ютараў мае прылады запісу на дыскі CD і DVD, USB-кошыкі для работы з уласнымі хард-дыскамі, прылады для чытання картаў памяці. У кожнай медыятэцы ўсталяваны шматфункцыянальны сеткавы апарат (прынтэр, сканер, капір).



Працаваць можна ў любой з медыятэк. Абавязковая ўмова — наяўнасць імя карыстальніка (Login), зарэгістраванага ў сетцы БДУ. Для студэнтаў імя карыстальніка ўказана на пластыкавым студэнцкім білеце. На сайце http://intranet.bsu у раздзеле "Выхад у Інтэрнэт для студэнтаў" апісваюцца тэхналогіі выкарыстання імёнаў карыстальнікаў і пароляў для студэнтаў у карпаратыўнай сетцы БДУ. Пры рэгістрацыі імя карыстальніка для студэнтаў пароль не задаецца. Студэнт самастойна павінен прызначыць пароль праз раздзел "Выхад у Інтэрнэт для студэнтаў", прычым зрабіць гэта трэба адразу пасля атрымання білета, каб гэтым імем не карысталіся іншыя.

**Медыятэкі працуюць у дзве змены (да 21.00), а таксама ў суботу (да 19.00).**

**Больш падрабязны графік працы і іншую неабходную інфармацыю пра медыятэкі і карпаратыўную сетку БДУ чытайце на сайце INTRANET.BSU.**

**Фота Юліі ПАПОВАЙ**

## "ГАРАЧАЯ ЛІНІЯ" ДЛЯ СТУДЭНТАЎ

У БДУ дзейнічае "Студэнцкая гарачая лінія" (тэлефон **209-54-16**). Яна створана для своечасовага рэагавання на канкрэтныя факты, кваліфікаванае вырашэнне студэнцкіх пытанняў і прапаноў па ўдасканальванні навучальна-выхаваўчага працэсу, іншых аспектаў дзейнасці ВНУ.

Акрамя таго, свае заўвагі, звароты і пытанні студэнты могуць адрасаваць рэктару універсітэта, апусціўшы ліст у скрыні "Пытанні рэктару", якія стаяць у кожным навучальным корпусе.

## З УСМЕШКАЙ

***

Прафесар — чалавек, які патрапіў ва універсітэт на першым курсе і так і не здолеў з яго выйсці.

***

— Што такое экзамен?

— Гэта гульня, у якой адзін ведае, але маўчыць, а другі не ведае, але гаворыць.

***

На што толькі ні пойдзе студэнт, каб атрымаць залік... Нават на лекцыю.

***

Два студэнты перад сесіяй:

— Што чытаеш?

— Квантавую механіку.

— А чаму кнігу дагары нагамі трымаеш?

— А якая, уласна кажучы, розніца?..

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

1 верасня 2006 года
Падпісана да друку 31.08.2006 г.
Зак.810. Тыраж 1000 экз.Ум. друк. арк 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Таццяна КАЗАК
Камп'ютарная вёрстка Аляксандра САЛАМАХІНА
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная рэдакцыі: вул. Бабруйская, 7, пакой 411, тэлефон 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by